**Вайна і мір у апавяданні М. Лынькова «Васількі»**
**Урок беларускай літаратуры ў 5 класе**

**М. Я. Галавач,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры першай катэгорыі

***Мэты:*** садзейнічаць асэнсаванню ідэйнага зместу твора, умець даказваць сваю думку, карыстацца тэкстам, характарызаваць вобразы, спрыяць развіццю маўлення, выразнаму чытанню твора, дапамагаць успрымаць гора, задумвацца над лёсам чалавека, ствараць пачуццё непрымання вайны як найвялікшага зла і бяды.

**Абсталяванне:** падручнік па беларускай літаратуры (частка 2), пытанні на лістах паперы, сімвалічныя карткі, прэзентацыя, песня «Жураўлі» ў выкананні М. Бернэса.

**Эпіграфы:** Войны! Злачынная справа – вайна выклікае і гнеў мой, і слёзы, і боль. ( М. Гусоўскі)
Можна навучыцца ваяваць, але прывыкнуць да вайны немагчыма. (К. Сіманаў)

**Ход урока**

1. **Арганізацыйны момант.**

***Настаўнік.*** Добры дзень. Сённяшні ўрок я хачу пачаць з верша А. Сумнага «Дарыце дабрыню». Паслухайце, калі ласка:

Зімой, праз вокны цёплага пакою,
Я кранаў позіркам людзей.
І ўсіх хацеў бы я сагрэць сабою,
Прытуліўшы моцна да грудзей.
Як часта не хапае людзям дабрыні,
Шкада, што грошы – многіх мэта.
Дарыце ўсмешку проста так,
І любоў, і праменьчык радасці і света.

Павярніцеся адзін да аднаго, усміхніцеся і падаруйце свайму сябру праменьчык дабрыні. І вось на гэтай цудоўнай ноце мы і пачнём наш урок.

2. **Уводзіны ў тэму. Мэтавызначэнне**

***Настаўнік.*** На партах у вас ляжаць сімвалічныя карткі. Падыміце іх, калі ласка. *(У вучняў на партах ляжаць карткі розных колераў.)* Кожны колер нешта сімвалізуе. Давайце паразважаем што. (*Адказы вучняў.)*

На дошцы змешчаны 2 лісты паперы. На адным лісце слова «МІР», а на другім – «ВАЙНА». Карткі якога колеру вы прымацуеце да гэтых лістоў? (*Вучні прымацоўваюць свае карткі.*)

– Якога ж колеру мір? (*Мір рознакаляровы.)*

– Карткі, якога колеру вы прымацавалі да слова ВАЙНА? (*Чорныя, карычневыя, барвовыя, шэрыя – колеры крыві, смерці, пакут.*)

– З якімі колерамі вам хацелася б жыць? (*Нам хацелася б жыць у рознакаляровым свеце.*)

***Настаўнік.*** Мы жывем ў мірны час. І гэта вельмі цудоўна. Пагэтаму нездарма слова МІР асацыіруецца толькі з яркімі колерамі. Але не трэба забываць і пра тое, што вайна – гэта гора, няшчасце, скалечаныя лёсы,

матуліны і дзіцячыя слёзы. Не трэба забываць для таго, каб вайна ніколі не паўтарылася. Вы – дзеці 21 ст., нарадзіліся ў мірны час. І гэта вялікае шчасце. Дзякуй Богу, што вы даведваецеся пра вайну толькі з кніг, фільмаў, часопісаў... Якія беларускія пісьменнікі пісалі пра вайну? (*Адказы вучняў.*)

Сапраўды, вайна пакінула жахлівы след у гісторыі нашай краіны. Па ўсёй тэрыторыі Беларусі, амаль у кожнай вёсцы штодня нагадваюць аб перажытым помнікі, мемарыялы, абеліскі.

Прыгадайце вядомыя ва ўсім свеце помнікі абаронцам Радзімы і ахвярам вайны, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі. (*Брэсцкая крэпасць, Хатынь, Курган Славы.)*

На мінулым уроку мы таксама гаварылі пра вайну, таму што пазнаёміліся з творам, у якім адлюстраваны падзеі ВАВ. З якім творам мы пазнаёміліся на мінулым уроку? («Васількі».)

Сёння мы працягнем працаваць над зместам гэтага апавядання, прааналізуем твор; узнавім ланцужок падзей, што адбываюцца ў апавяданні; паспрабуем даць адказ на пытанні: чаму твор мае такую назву? Прапаную запісаць тэму ўрока

**3. Праверка дамашняга задання**

***Настаўнік.*** Давайце ўзнавім змест твора пры дапамозе плана. Прыём называецца «Працягні сказ». Я напісала пачатак сказа ў плане, а вы дапішыце канцоўку. Тым самым праверым, як уважліва вы перачыталі дома твор.

1) <u>Абмеркаванне плана твора</u>
   1. Прыгожы дзень ... (жніўня).
   2. Вяртанне з ... (лесу).
   3. Вясёлая ... (груша-дзічка).
   4. Спахмурнелае ... (дрэва).
   5. Вялікая ...(страта).
   6. Адпомсціць... ( фашыстам).
   7. Яго бачылі ў ... (мястэчку).
   8. Наце ж ... (вам).
   9. Сляды ўсмешкі, ..., ... (слаўнай, дзіцячай).

**4. Праца па тэме ўрока**

<u>1. Выбарачна накіраваны аналіз апавядання</u>

- ✓ Прачытайце выразна апісанне прыгожага летняга дня ў пачатку твора. Якім настроем яно прасякнута? (*С. 35-36, адказы вучняў.*)
- ✓ Ці адпавядае апісанне прыроды душэўнаму стану хлопчыка? *(Так, адпавядае.)*
- ✓ Раскажыце, пра што мараць хлопчыкі, вяртаючыся з лесу. (*С. 37, пераказ эпізода вучнем.)*
- ✓ Які падарунак Міколка падрыхтаваў для сваёй сястрычкі? (*Васількі.*)
- ✓ Назавіце сінонім да слова васількі. (*Валошкі.*)

<u>2. Разрыў</u>

***Настаўнік.*** Я знайшла цікавую інфармацыю пра васілікі, або валошкі. Васілёк (валошка) на мове кветак: «Не смею выказаць табе свае пачуцці»; далікатнасць, прыгажосць, прастата, а таксама – весялосць і вернасць. Гэта сімвал міру, радасці, шчаслівага дзяцінства. Аднак у некаторых народаў

сімвалізуе нянавісць. Як вы лічыце, якое тлумачэнне падыходзіць да нашага твора? *(Адказы вучняў.)*

3. Калектыўная праца па аналізу твора

***Настаўнік.*** Мы ўжо адзначылі, што ў некаторых народаў васілёк сімвалізуе нянавісць. Да каго была нянавісць у Міколкі і чаму? *(Адказы вучняў.)* Як пісьменнік апісвае душэўны стан хлопчыка, калі ён убачыў забітых немцамі маці і сястрычку? Падмацуйце адказ радкамі з тэксту. (*Чытанне эпізода.)*

- ✓ Прачытайце апісанне грушы-дзічкі перад трагедыяй і пасля. Як гэтыя апісанні дапамагаюць зразумець душэўны стан хлопчыка? (*С. 39. Нават прырода пакутуе, перадае душэўны стан героя.)*
- ✓ Да каго звяртаецца Міколка за парадай і падтрымкай? Прачытайце па асобах размову дзеда Нупрэя з хлопчыкам. (*С. 41, чытанне па асобах.)*
- ✓ Як паводзіць сябе дзед Нупрэй? Дакажыце, што ён перажывае, хвалюецца.
- ✓ Чаму Міколка змог выплакацца толькі пасля размовы з дзедам Нупрэем?
- ✓ Якое рашэнне прыняў Міколка? Якія рэчы ўзяў з сабой? (*Адказы вучняў.)*
- ✓ Раскажыце, як хлопчык адпомсціў немцам за смерць маці і сястрычкі. *(Пераказ эпізода.)*
- ✓ Прачытайце фінальны эпізод апавядання. Якія дэталі вас кранулі да глыбіні душы? Якім пачуццём ён прасякнуты? (С. 44.)
- ✓ Як вы ацэньваеце ўчынак Міколкі? *(Развавжанні вучняў.)*

ФІЗКУЛЬТХВІЛІНКА

4. Прыём «Анкета 5 з 25»

***Настаўнік.*** Назавіце рысы характару, якія, на ваш погляд, уласцівы Міколку. *(Анкета кожнаму на парту.)*

***Анкета 5 з 25***

Кемлівасць, упартасць, працавітасць, легкадумства, смеласць, знаходлівасць, злосць, дурасць, мудрасць, шчырасць, летуценнасць, памяркоўнасць, незалежнасць, сумленнасць, трусасць, шчырасць, сціпласць, суровасць, патрыятызм, таленавітасць, жорсткасць, цярплівасць, мужнасць, упэўненасць, ветранасць.

- ✓ Хто такі герой? Знайдзіце тлумачэнне ў слоўніку. (*Праца з тлумачальным слоўнікам.)*
- ✓ Ці можна Міколку назваць героем? Чаму? (*Адказы чучняў.*)

**5. Абагульненне**

***Настаўнік.*** Калі мы пішам сачыненне, складаем казку або верш, заўжды думаем над тым, якую даць назву твору. Міхась Лынькоў назваў сваё апавяданне «Васількі». Давайце паразважаем, чаму. Перш, знайдзіце сказы, у якіх ужыта слова васілёк, выпішыце ў сшытак. (*Работа ў парах.*)

Зверху лісты папараці, каб не трапіў пыл у кошык, ды некалькі **запазнелых (перад самай восенню)**васількоў.

Васількі **для сястрычкі ( любоў да сястрычкі)…**

… ды выпалі з-за пазухі і ляжалі ў пыле запазнелыя васількі **(няма радасці – страх: забітыя маці і сястрычка)**

сінімі васількамі адцвіталі (**галоўная ідэйная нагрузка**) і вочы хлопчыка ( **метафара** «**вочы адцвіталі**» – загінуў, помсцячы за маці і сястрычку)
*( Адказы вучняў.)*
***Настаўнік.*** Як бачым, слова «васількі» непарыўна звязана з развіццём падзей ў творы і ідэйным зместам апавядання. Успомніце яшчэ раз сімвалам чаго з'яўляюцца васількі? Чаму твор называецца «Васількі»? *(Гэта сімвал міру, радасці, шчаслівага дзяцінства).* Якую б назву далі вы апавяданню? Чаму *(Адказы вучняў.)* Што хацеў сказаць аўтар гэтым апавяданнем? (*Адказы вучняў.)*

Мы з вамі ўжо больш за 70 гадаў жывём пад мірным небам. Наша Беларусь – мірная краіна. Пагэтаму я здымаю ліст са словам ВАЙНА, а пакідаю толькі рознакаляровы ліст са словам МІР.

Давайце складзем сінквейн да слова МІР. (*Творчая праца вучняў.)*

Мір.
Яркі, шчаслівы.
Радавацца, будаваць, жыць.
Няхай будзе мір ва ўсім свеце!
Радасць.
(Жыццё)

***Настаўнік.*** Хай заўсёды будзе МІР у вашай хаце.

**6. Рэфлексія**

Вазьміце сінія папяровыя кветкі (валошкі), напішыце словы аб вашых пачуццях, уражаннях ад урока. (*Некалькі вучняў зачытваюць.*)

**7. Выстаўленне і каменціраванне адзнак**

**8. Дамашняе заданне**

Вуснае міні-сачыненне «Вайна ў дзіцячых сэрцах»



# Брэсцкая крэпасць



# ХАТЫНЬ



# Курган Славы



# Плана твора

| | |
|---|---|
| + Прыгожы дзень ... | жніўня |
| + Вяртанне з ... | лесу |
| + Вясёлая ... | груша-дзічка |
| + Спахмурнелае ... | дрэва |
| + Вялікая ... | страта |
| + Адпомсціць... | фашыстам |
| + Яго бачылі ў ... | мястэчку |
| + Наце ж ... | вам |
| + Сляды ўсмешкі, ..., ... | слаўнай, дзіцячай |



Васілёк (валошка) - на мове кветак "Не смею выказаць табе свае пачуцці"; далікатнасць, прыгажосць, прастата, а таксама - весялосць і вернасць. Гэта сімвал міру, радасці, шчаслівага дзяцінства. Аднак у некаторых народаў  сімвалізуе нянавісць.



Гэта сімвал міру, радасці, шчаслівага дзяцінства.